# Тамара Аксёнава:
# «Нацыянальную бібліятэку будуем талакой»

**Сёлета Нацыянальная бібліятэка Беларусі адзначыць сваё 80-годдзе. Пакуль у старым будынку, але з марай пра пераезд.**

Па меркаванню намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Тамары Аксёнавай, найбуйнейшае кніжнае сховішча краіны «вырасла» з цяперашніх плошчаў яшчэ 30 гадоў назад. Да галоўнага корпуса бібліятэкі, пабудаванага ў далёкім 1932 годзе па праекту архітэктара Лаўрова, ужо праз трыццаць гадоў прыйшлося дадаць будынак па Кірава, 49, а ў сярэдзіне 80-х і будынак былога райкама партыі.

— Сёння унікальны фонд бібліятэкі налічвае каля васьмі мільёнаў экземпляраў больш чым на 50 мовах свету, — тлумачыць Тамара Аксёнава. — Сярод іншага мы захоўваем калекцыю рэдкіх рукапісаў і старадрукаваных выданняў, беларускі фонд (больш 600 тысяч экземпляраў).

Недахоп месца адчуваецца літаральна пачынаючы з гардэроба. Цесна не толькі дакументам, чытачам (дзейнічае 14 чытальных залаў на тысячу месцаў), але нават супрацоўнікам бібліятэкі, колькасць якіх за апошнія 30 гадоў падвоілася. Не дазваляюць старыя будынкі і механізаваць шэраг працэсаў: укараніць пнеўмапошту, тэлеліфты і інш. Дакументы з фондасховішчаў па старынцы дастаўляюцца на цялежках.

— У 1988—1990 гадах, калі Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб будаўніцтве новага будынка, справа зрушылася з мёртвай кропкі, — успамінае Тамара Уладзіміраўна. — Градабудаўнікі вызначылі найлепшы ўчастак пад бібліятэку, абвешчаны ўсесаюзны конкурс на праект выйгралі архітэктары Віктар Крамарэнка і Міхаіл Вінаградаў. Пачалася работа над эскізным праектам...



Завершыць пачатую справу перашкодзілі добра вядомыя падзеі. І толькі візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў Нацыянальную бібліятэку ў лістападзе 2001 вярнуў надзею на новы «дом» для найбуйнейшага кнігасховішча. Цяпер былая «ленінка» можа разлічваць на пераезд ужо да канца 2005 года.

Чаму спыніліся менавіта на праекце Крамарэнкі-Вінаградава? Ён прывабіў нас сваёй тэхналагічнасцю. Архітэктура будынка прадугледжвае тры-чатыры паверхі, дзе мяркуецца размясціць усе ўнутраныя службы бібліятэкі: паступленне дакументаў, экспедыцыю, аддзел камплектавання, аддзел апрацоўкі дакументаў, а таксама чытальныя залы. Для фонду бібліятэкі прадугледжана кнігасховішча на 14 мільёнаў экземпляраў, якое размесціцца на 19 паверхах у шарападобным купале. Дарэчы, гэты купал, шматграннік па форме, падобны на крышталь, па задумцы архітэктараў, будзе сімвалізаваць накапленне ўсіх ведаў, створаных чалавецтвам. Агульная плошча новага будынка (85.300 квадратных метраў) — несупастаўімая з плошчай цяперашняга. Колькасць месцаў у чытальных залах — 1850. Прадугледжаны вялікая канферэнц-зала, прасторныя холы, кафэ, кабінеты для індывідуальнай працы. Усяго, здаецца, і не пералічыш. Мяркуецца ўкараніць усе апошнія тэхнічныя рашэнні: механічную дастаўку дакументаў, сістэмы пажаратушэння, пылавыдалення і кандэцыяніравання паветра.

З'явіцца будынак у маляўнічым месцы мікрараёна Усход-1. З яго вокнаў адкрыецца прыемны від на яблыневы сад. Пачаць будаўніцтва плануецца ўжо ў красавіку будучага года. Будоўля грандыёзная, таму яна сапраўды, гаворачы словамі прэзідэнта, павінна стаць «агульнанацыянальным праектам». У Беларусі заўсёды ўсе вялікія справы рабіліся талакой. І гэта не стане выключэннем. Пасільны ўдзел прымуць прадпрыемствы і арганізацыі, фірмы, прадпрымальнікі, усе грамадзяне Беларусі. Пакласці свой камень у такую будоўлю — ганарова.

**Сяргей ПРОТАС.**

***P.S.*** *Сродкі на будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі можна пералічыць на дабрачынны рахунак нумар 3625000000038 у філіяле 525 АСБ «Беларусбанк», код банка 122.*